ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЭЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 31 (4283)
Субота, 6 лютага
1932 г.

МЕНСК, Савецкая 61

ПЕРАДАВАЯ — Наперад, да другой пяцігодкі!

АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ — Даклад тав. МОЛАТАВА на XVII партканфэрэнцыі (1 стар.).

Вынікі разьвіцьця прамысловасьці ў 1931 г. і задачы на 1932 г. — Даклад тав. АРДЖАНІКІДЗЭ (2-3 стар.).

ДРУГІ ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ — Абавязак кожнага райку арганізаваць праверку і самаправерку падрыхтаванасьці (3 стар.).

Загатаўляць ня менш 10 проц. сіраду ў пяцігодцы (3 стар.).

Выпруціць самацёк з практыкі жывёлазагатовак (3 стар.).

Генэральная атака Шыхаю (4 стар.).

Ліквідаваць залежы запасных частак на «Чырвоным штампаўшчыку» (4 стар.).

4 ЛЮТАГА ЗАКРЫЛАСЯ XVII УСЕСАЮЗНАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ

Па скончэньні канфэрэнцыі адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б).

Пленум зацьвердзіў рэзалюцыі XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі па дакладах т. т. Арджанікідзэ, Молатава і Куйбышава.

З прычыны абраньня т. РУДЗУТАКА старшынём ЦКК УсеКП(б), пленум выказаў яго ад абавязкаў члена палітбюро ЦК. Пленум пацьвердзіў палітбюро ЦК, увёўшы ў яго склад тав. АНДРЭЕВА.

Наперад, да другой пяцігодкі пабудовы сацыялізму

Скончылася XVII партыйная канфэрэнцыя.

Канфэрэнцыя прыняла важнейшыя пастановы аб рабоце прамысловасьці ў апошнім, завяршальным годзе першай пяцігодкі і аб плане другой пяцігодкі. Пастановы канфэрэнцыі зацьверджаны пленумам ЦК.

6 год назад на XIV партыйным зьезьдзе тав. Сталін выкінуў лёзунг сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай краіны, якая толькі што выйшла з адбудоўчага перыяду. Пастановы XIV зьезду прымаліся і потым праводзіліся ў жыцьцё ў жорсткай барацьбе з зіноўеўскай апазыцыяй, а потым трацкісцка-зіноўеўскім апазыцыйным блёкам, якія, прыкрываючыся «левай» фразай, на справе капітулявалі перад труднасьцямі пабудовы сацыялізму ў нашай краіне.

XV зьезд канстатаваў падрабязныя посьпехі палітыкі індустрыялізацыі, і XVI канфэрэнцыя рубам паставіла пытаньне аб тэмпах сацыялістычнай індустрыялізацыі, аб такіх тэмпах, якія дазволілі б нам магчымасьць дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны. XV зьезд зноў выстрыў увагу партыі на разьвіцьці цяжкай індустрыі ў першую чаргу, як асновы і базы сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. XV зьезд канстатаваў перад партыяй і другую важнейшую задачу — сацыялістычную рэканструкцыю нашай сельскай гаспадаркі, пераводу ад дробнай і драбнейшай сялянскай гаспадаркі да буйнога аграмаднага земляробства. XV зьезд выключыў з партыі трацкісцка-зіноўеўскую апазыцыю, якая імкнулася сарваць тэмпы будаўніцтва сацыялізму.

Правядзеньне ў жыцьцё пастаноў зьезду аб бальшэйшых тэмпах індустрыялізацыі, аб разьвіцьці цяжкай індустрыі ў першую чаргу, аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, шырокім буйнавытвор'ем саўгасаў і калгасаў і ўзмацненьні наступленьня на кулака натрапіла на жорсткае супраціўленьне правай апазыцыі, якая сфармілася, як агентура кулака ўнутры партыі, і фактычна процідзейнічала шляху сацыялістычнай рэканструкцыі, намечанаму партыяй, шляху капіталістычнай рэстаўрацыі. У момант самай жорсткай і абвостранай барацьбы з правай апазыцыяй, партыя на XVI партыйнай канфэрэнцыі, на аснове пастановаў XV зьезду, прыняла плян першай пяцігодкі. XVI зьезд увайдзе ў гісторыю нашай партыі, як зьезд сацыялістычнага наступленьня, як зьезд суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як класы, як першы зьезд пэрыяду сацыялізму, у які ўступіла савецкая краіна, як зьезд поўнага ідэйнага выкрыцьця і разгрому правага апартунізму, погляды якога зьезд прызнаў несумяшчальнымі з прыналежнасьцю да партыі.

Праўда, пасьля зьезду супроць партыі стварыўся новы апартуністычны блёк з асоблівай правага апартунізму і трацкісцкага прыхвосьня — так яны права-«левацкі» блёк. Характэрнымі асаблівасьцямі блёку былі бяспрынцыпнасьць, двурушніцтва і праваапартуністычная плятформа. Аднаўшы проч з дарогі кучку збанкрутаваных капітулянтаў, правакуючы далей непрымірымую барацьбу на два фронты, супроць правага і «левага» апартунізму і супроць прымірэнцтва, партыя падышла да XVII партканфэрэнцыі з новымі вялізарнымі посьпехамі, якія забясьпечваюць ажыцьцяўленьне асноўных лёзунгаў XVI партыйнага зьезду аб выкананьні пяцігодкі за чатыры гады і аб суцэльнай калектывізацыі ўсяго Савецкага Саюзу.

Набудуем фундамант сацыялістычнай эканомікі. Магутнае разьвіцьцё цяжкай індустрыі, асабліва машынабудаўніцтва, ужо стварыла базу для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Пасьля ўпартай, напружанай барацьбы партыя дабілася пералому на рашаючых участках прамысловасьці, адставаньне якіх мацней за ўсё забівалася на выкананьні пляну пяцігодкі, на участках вугалю і металю.

Дасягнутыя рашаючыя посьпехі ў аўладаньні тэхнікай важнейшых вытворчасьцяй, якія вызваляюць нас ад замежнай залежнасьці.

Дасягнутыя рашаючыя посьпехі ў барацьбе за адхараўленьне чыгуначнага транспарту, які зьяўляецца зараз найбольш вузкім месцам нашай народнай гаспадаркі. Дасягнута пашырэньне разьвіцьця лёгкай індустрыі.

Разгорваецца савецкі гандаль, паляпшаецца матар'яльнае становішча шырокіх рабочых і працоўных мас. Суцэльная калектывізацыя і ліквідацыя кулацтва прыводзяць ў апошнім у рашаючых збожжавых раёнах нашай краіны. Усіх гэтых посьпехаў партыя дабілася на аснове барацьбы з апартунізмам і на аснове канкрэтнага бальшавіцкага кіраўніцтва ЦК на чале з тав. Сталіным.

Пастановы XVII канфэрэнцыі намячаюць для прамысловасьці базную праграму на чацьверты, апошні год пяцігодкі і даюць асноўныя кірункі для складаньня пляну другой пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы сацыялізму. Намечаны вехі далейшага пераможнага шляху разгорнутага сацыялістычнага наступленьня. Пастаўлена практычная задача ліквідацыі капіталістычных элементаў, клясаў наогул, пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Шлях да бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ляжыць праз жорсткую клясавую барацьбу, праз далейшае ўмацаньне дыктатуры пролетарскай дыктатуры, праз далейшае ўмацаваньне ленінскай партыі.

Супроць нас — перш за ўсё міжнародная буржуазія. Супроць нас разгромленае, але яшчэ не ліквідаванае кулацтва, якое жахае і будзе жахаць рашаючае супраціўленьне. Задача сацыялістычнага перавыхаваньня калішніх мас, задача выхаваньня адсталых пластоў пролетарыяту, новых кадраў рабочых стаіць перад намі з усёй вострасьцю.

Наперадзе, супроць нас — апартуністы розных масьцей, які бесьтэрміновага жыцьця і падтрымліваецца супраціўленьнем клясавага ворага, прабуе яшчэ тармазіць наш рух наперад. Супраціўленьне клясавага ворага — гэта перш за ўсё супраціўленьне кулацтва. Правы апартунізм у партыі — адлюстраваньне кулацкага супраціўленьня ў краіне. Правы апартунізм унутры партыі застаецца галоўнай небясьпекай на сучасным этапе. І ўмоўнай пераможнага перамаганьня правага апартунізму па-ранейшаму зьяўляецца самая рашучая барацьба з «левымі» настроямі, «левымі» загібамі, «ляваццкім» пражэктэрствам, галавакружэньнем ад посьпехаў, якія дапамагаюць правагу апартунізму і кулаку, што стаіць за яго сьпіной. Гнілы лібералізм, аб якім пісаў тав. Сталін у рэзалюцыі «Пролетарской революции», праяўляецца ў прыміраючых адносінах да клясавага ворага (у прыватнасьці да контр-рэвалюцыйнага трацкізму) і да апартунізму, у неахаваньні змагацца з імі ці на глебе стомленасьці, ці на глебе страты клясавай пільнасьці, ці на глебе простага пазначаленьня асобных членаў партыі ўплыву клясавацкай ідэалёгіі.

Неаслабны агонь па апартунізьме і гнілым лібералізьме на ўсіх франтах сацыялістычнага будаўніцтва — гэта неабходнейшая ўмова далейшых пераможных шляхоў нашага сацыялістычнага наступленьня, далейшага ўмацаваньня незалежнасьці і абароназдольнасьці нашай краіны, выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, заваяваньня поступаў да другой пяцігодкі, завяршэньня ліквідацыі кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі, пасьпяховага выкананьня вялізарных задач другой пяцігодкі, намечаных XVII партыйнай канфэрэнцыяй.

Праз выкананьне праграмы чацьвертага, завяршальнага году пяцігодкі, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, на чале з тав. Сталіным, **наперад, да другой пяцігодкі пабудовы сацыялізму.**

(«ПРАВДА»).



Прэзыдыум канфэрэнцыі.

17-я Усесаюзная партканфэрэнцыя

АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ

Даклад тав. В. М. МОЛАТАВА

Таварышы! Самы факт, што наша партыя прыступае да абгаварэньня задач другога пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі, гаворыць за сябе. Ён гаворыць, перш за ўсё, аб тым, што наш першы пяцігадовы плян выконваецца з посьпехам. Ён гаворыць, далей, аб тым, што ў нас ёсьць поўная ўпэўненасьць, што 1932 год будзе годам завяршэньня пяцігодкі, што мы першую пяцігодку скончым за чатыры гады. На значэньні гэтага факту, факту прапрацоўкі СССР другога пяцігадовага пляну трэба спыніцца.

Па-першае, аб міжнародным значэньні гэтага факту. Міжнароднае значэньне гэтага факту заключаецца ў тым, што рабочы краіны, што працоўны любой дзяржавы мае магчымасьць параўнаць рэзультаты паяваньня буржуазіі ў капіталістычных дзяржавах з рэзультатамі, з першымі яшчэ рэзультатамі паяваньня рабочай клясы ў краіне пролетарскай дыктатуры. Пры гэтым мы не алмаўляемся ад параўнаньня з самымі перадавымі ў тэхніка-эканамічных адносінах, з самымі багатымі і з самымі магутнымі ў капіталістычным сьвеце краінамі. У даны момант, калі крызіс ахапіў усе капіталістычныя краіны і паглыбляецца ўсё далей, вруйнуючы прамысловасьць і іншыя галіны гаспадаркі, пераўваньне буржуазных дзяржаў з Савецкім Саюзам асабліва паразьлівае. Гэта параўнаньне дае магчымасьць бяз хістаньняў адказаць на пытаньне аб тым, за кім будучыня—за пролетарыятам і яго ўладай, ці за буржуазіяй і яе панаваньнем? Ясна, што з міжнароднага пункту гледжаньня наш посьпех, пераможны посьпех будаўніцтва сацыялізму, увасаблёны ў пасьпяховым ажыцьцяўленьні першай пяцігодкі і цяпер у першых гадох другой пяцігодкі, для рабочых і працоўных усіх краін гаворыць аб тым, што будучыня не за панаваньнем буржуазіі, а за дыктатурай пролетарыяту, што факты гаворыць супроць капіталізму, у карысьць сацыялізму.

Па-другое, з пункту гледжаньня ўнутры-савецкага факт нашага пераходу да задач другой пяцігодкі таксама гаворыць шмат аб чым. Гэта адна з рашаючых праверак таго, што дае кіраўніцтва рабочай клясы ў адносінах сялянскай масы пасьля зьвяржэньня ўлады буржуазіі. У СССР упяршыню ў сусьветнай гісторыі ўлада знаходзіцца ў руках рабочай клясы, якая вядзе за сабой працоўныя масы вёскі, ажыцьцяўляе разам з імі перабудову ўсёй народнай гаспадаркі на сацыялістычнай аснове. Наш посьпех, пераможны посьпех рабочай клясы, заключаецца ў тым, што разгортваецца будаўніцтва сацыялізму ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы, што і самая адсталая частка працоўных, працоўныя вёскі пачынаюць узьнімацца да сацыялізму, да бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Нарэшце, непасрэдна з гаспадарчага пункту гледжаньня, нашы посьпехі ёсьць посьпехі плянавага сацыялістычнага будаўніцтва. Да гэтага часу ні ў адной краіне, нідзе ў сьвеце ня было плянавай дзяржаўнай гаспадаркі. Мы робім тут першыя крокі, і рэзультаты ўжо ў наяўнасьці. Ад выкананьня адных заданьняў мы пераходзім да новых і з кожным годам усё больш буйных посьпехаў плянавай сацыялістычнай гаспадаркі. Гэта ня толькі і назват ня столькі посьпех непасрэдна нашых гаспадарча-плянавых органаў. Наша плянаваньне і ўлік не абмяжоўваюцца гэтымі параўнальна вузкімі рамкамі. Сапраўдная гаспадарчая работа, арганізацыя народна-гаспадарчага ўліку і выпрацоўка пляну можа весьціся і на справе выдзеліцца з актыўным удзелам рабочых мас, часамі ў ходзе прапрацоўкі на мясцох, якія значна мяняюць першапачатковыя намячэньні.

Апіраючыся на гэту актыўнасьць рабочай клясы і працоўных у сацыялістычным будаўніцтве, выпрацоўваюцца пад кіраўніцтвам партыі гаспадарчыя пляны.

Нельга таксама забываць той вялізарнай работы па выпрацоўцы пляну народнай гаспадаркі, якая адбывалася перад падрыхтоўкай другога пяцігадовага пляну.

Першым плянам народнай гаспадаркі быў плян электрафікацыі, плян «ГОЭРЛО». Гэта быў чарнавы накідак, пачатак, завязка справы ўсеагульнай тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі нашай краіны. Гэта работа мела вялізарнейшае значэньне для ўсёй нашай гаспадарчай работы і для разьвіцьця самой справы плянаваньня. Мы ведаем, далей, што ў свой час была праведзена вялікая работа па складаньні першых гадавых пляноў—«кантрольных лічбаў народнай гаспадаркі». Упяршыню кантрольныя лічбы былі зацьверджаны ў 1925-26 годзе, з гэй пары яны зацьвярджаюцца кожны год і набываюць усё большае значэньне для справы гаспадарчага кіраўніцтва.

Амаль адначасова з выпрацоўкай першых гадавых народна-гаспадарчых пляноў пачалі падрыхтоўвацца больш шырокія пляны перабудовы народнай гаспадаркі. На працягу раду год вялася работа па падрыхтоўцы першай пяцігодкі і адначасова падрыхтоўваўся так званы «генэральны плян» перабудовы народнай гаспадаркі з разьлікам на 10-15 год. Гэта апошняя работа ня была скончана. Але наколькі была выпрацавана і ажыцьцяўляецца першая пяцігодка і цяпер выпрацоўваецца другая пяцігодка, настолькі асноўныя пытаньні так званага «генэральнага пляну» вычэрпваюцца гэтымі дзьвюма пяцігодкамі, а часткова ўжо ставяцца ў больш разгорнутым выглядзе. І так, перад намячэньнем другой пяцігодкі адбывалася вялікая работа, і без яе былі-б немагчымымі падрыхтоўка і абгаварэньне пытаньняў другога пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі.

I. Да выніку першай пяцігодкі

Вы ведаеце, таварышы, што партыі былі паданы два варыянты пяцігодкі, а іменна: «адпраўны» і «аптымальны». Аптымальны варыянт быў разьлічан на найбольшы спрыяючыя, па думцы Дзяржпляну, умовы для Савецкага Саюзу. Партыя прыняла за аснову аптымальны варыянт, г. зн. плян з вышэйшымі гаспадарчымі заданьнямі. Іменна гэты аптымальны, разьлічаны на спрыяючыя ўмовы, пяцігадовы плян мы зараз і выконваем. Партыя дабілася таго, што выступуты сакалі масаві лёзунг: «Пяцігодка—за чатыры гады» ажыцьцяўляецца пераможна. Мы ажыцьцяўляем указаны аптымальны варыянт пяцігодкі не за пяць год, як у пачатку намячалі, а за чатыры гады, г. зн. скарачаючы на 1/5 тэрмін выкананьня пяцігадовага пляну ў яго аптымальным (вышэйшым) варыянце.

Посьпехі першай пяцігодкі, посьпехі палітыкі індустрыялізацыі і, значыць, палітыка ўздыму цяжкай індустрыі, выраб сродкаў вытворчасьці ў першую чаргу. Гэтыя посьпехі характарызуюцца тым, што мы маем да сучаснага моманту ўласную базу для завяршэньня тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Для справы далейшага росту сацыялізму ў СССР гэты факт мае рашаючае значэньне. Посьпехі першай пяцігодкі знаходзяць сваё выдзяленьне таксама ў выключных посьпехах калектывізацыі, у разгорнутым будаўніцтве саўгасаў і калгасаў. У адсталай, ніччэ ўчора раздробленай вёсцы будуецца цяпер буйная сацыялістычная гаспадарка на аснове машыннай тэхнікі. Мы ўжо дасягнулі такога становішча, што і ў сельскай гаспадарцы пануючае становішча займаюць сацыялістычныя формы. Гэтым выражана самая цяжкая і самая важная задача пралетарскай рэвалюцыі.

Як-бы ня былі вялікі, проста грандыёзны задачы другой пяцігодкі, нельга забываць аб тым, што пасьля Кастрычніцкага перавароту самая цяжкая задача заключаецца ў перабудове сельскай гаспадаркі на базе калектывізму і высокай машыннай тэхнікі. І іменна гэту задачу **партыя пераможна ажыцьцяўляе і ажыцьцяўляе і ня можа быць ніякага сумненьня ў тым, што ў 1932-33 годзе калектывізацыя ў СССР у аснoўным будзе скончана.**

Усё гэта дало магчымасьць партыі сказаць, што карэннае ленінскае пытаньне «хто каго» вырашана супроць капіталізму, вырашана ў карысьць сацыялізму. Гэта важнейшы вынік для ўсяго ня толькі гаспадарчага, але і палітычнага разьвіцьця СССР за мінулы перыяд.

Нельга не бачыць, што за гэтыя гады ня ўсё выконвалася паводле намечанага пляну. Ня толькі па асобных гадох, але і ў цэлым партыя ўнесла зьмены ў першую пяцігодку. Падам некалькі прыкладаў. У пяцігодцы, напрыклад, не намячалася, што нават да канца пяцігодкі беспрацоўе ў нашай краіне будзе поўнасьцю ліквідавана. Так, пяцігадовы плян намячаў вялізарнае скарачэньне беспрацоўя, але ў той момант, у момант яго прыняцьця, прадбачыць, што беспрацоўе ў СССР будзе ліквідавана ўжо ў 1930-31 годзе, аказалася немагчымым. Як бачыце, мы крыху парушылі плянавае намячэньне, але можна спадзявацца, што такая зьмена, або, вярней, такое паляпшэньне пляну цалкам у інтарэсах рабочай клясы і сустракаецца ёю з поўным спачуваньнем.

У адносінах гаспадарчых задач першая пяцігодка партыя ўнесла такую вялікую зьмену, як стварэньне новай матэрыяльнай базы на Ўсходзе ва Урала-Кузьнецкім раёне.

Ні ў адным з чатырох томаў пяцігадовага пляну аб матэрыяльнай базе на Ўсходзе нічога не гаворыцца, але ці можна цяпер абмяркоўваць першую пяцігодку без таго, каб не гаварыць аб новай матэрыяльнай базе ва Урала-Кузьнецкім раёне, якая намі стварацца? Зразумела, нельга. Тым больш цяпер, калі пушчана першая домна ў Магнітагорску і на чарзе пуск новых домнаў у Магнітагорску і Кузьнецку. Такім чынам, і тут унесена праўка ў пяцігодку, праўка на дрэнная, праўка добрая, супроць якой ні адзін рабочы СССР ня толькі не пярэчыць, а наадварот, гатовы ўсялякі падтрымліваць яе.

Пяцігодка прадугледжвала адны тэмпы калектывізацыі, выйшлі другія. Мы ўжо даўно аператалі праз тэмпы калектывізацыі і разгортаньня саўгасаў, якія намячаліся ў пяцігодцы. Гэта таксама вельмі істотная праўка да пяцігадовага пляну, але праўка ня дрэнная, такая праўка, якая сур'ёзна паляпшае справу. У мільённых масах сялянства, як гаворачы ўжо аб рабочай клясе, няма пярэчаньняў супроць гэтай «праўкі», як цалкам адпавядаючай палітыцы партыі, ленінізму. На жаль, нельга сказаць, што нашы праўкі да пяцігадовага пляну былі зроблены толькі ў добры бок. Сёе-тое атрымалася ў нас і наадварот.

Нельга, напрыклад, забываць аб наступных трох момантах. Мы ня выканалі заданьня па ўзьнімцы прадукцыйнасьці працы ў прамысловасьці. Гэта наш вялізарны мінус. Ясна, што мы павінны ўсё зрабіць для таго, каб папраўць гэту справу, апіраючыся на ўмацаваньне пралетарскай дысцыпліны, рост тэхнікі і аўладаньне ёю нашымі кадрамі.

Мы ня выканалі таксама намячэньня пяцігодкі ў адносінах росту ўраджайнасьці. Мы знаходзімся тут ўсё яшчэ на вельмі нізкім фронце, значна больш нізкім, чым у намячэньнях пяцігодкі. Ясна, што трэба і на гэтай частцы падцягнуць фронт, папраўць справу.

Мы ня выканалі і адчуваем кожны дзень, што ня выканалі задач па рэканструкцыі транспарту, чыгуначнага асабліва. Відавочна, што і па гэтай частцы цімат і ўвагу трэба працаваць, каб хутчэй палепшыць справу, каб узьняць на належную вышыню наш транспарт.

Дробязі першай пяцігодкі з палітычнага пункту гледжаньня будуць асьветлены невыстарчальна, калі не закрануць пытаньня аб тым, у якіх умовах разгортвалася барацьба партыі за выкананьне пяцігодкі, з якой крытыкай і контр-прапановамі выступалі апазыцыйныя групы як з боку трацкізму, так і з боку праваўхілістаў. Урокі мінулага маюць першарадное значэньне для партыі і для ўсёй рабочай клясы. Таму неабходна напомніць, прыпамсі, важнейшыя моманты барацьбы партыі з так званымі «левымі» і правымі ўхілістамі. Тым больш, што барацьба з палобнага роду ўхіламі і асабліва з правай небясьпекай, як галоўнай, яшчэ і ў далейшым.

Нагадаю, што дырэктывы па першай пяцігодцы былі ўхвалены Цэнтральным камітэтам перад XV зьездам партыі і абмяркоўваліся на гэтым зьезьдзе. Супроць тэзісаў ЦК аб першай пяцігодцы трацкісцкая апазыцыя выступіла сваімі контр-тэзісамі. Гэта быў вельмі цухлы дакумант, наскрозь варожы лініі партыі, заключаны ў сабе, здаецца, ўсё, якія толькі можна ўявіць, паклёпніцкія выдумкі супроць ЦК. Напомню, далей, што правыя ўжо ў момант прыняцьця XVI партыйнай канфэрэнцыяй тэзісаў аб пяцігадовым пляне, папрабавалі выступіць са сваімі контр-плянам. Варта хаця-б зазначыць на так званую «двухгодку», якая ў замаскаваным выглядзе процідзяўлялася пастанове ЦК аб пяцігадовым пляне і па сутнасьці процідзяўлялася палітычнай лініі партыі.

Аб усім гэтым даводзілася ў падзеі мінулага з пункту погляду вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва апошніх 3-4 год. У сувязі з гэтым мне прыдзецца прывесьці некалькі вытрымак з дакумантаў і выступленьняў апазыцыянэраў трацкісцкага, праваапартуністычнага толку.

Возьмем пытаньне аб капітальным будаўніцтве прамысловасьці, якое мае, як усім вядома, буйнейшае палітычнае значэньне ў ажыцьцяўленьні індустрыялізацыі. Вось што пісалі трацкісты ў сваіх тэзісах аб сырцовых і экспартных рэсурсаў заможна-кулацкай часткі вёскі:

І далей: «Ідзе хуткі рост капіталістычных элементаў земляробства на базе дробнай таварнай вытворчасьці. Расьце, дакуючы гэтаму, залежнасьць дзяржаўнай гаспадаркі ад кулацка-капіталістычных элементаў у галіне сырцу, экспарту, харчовых запасаў» (падкрэслена ў арыгінале).

Няма патрэбы займацца зараз падрабязным разборам гэтых трацкісцкіх ваяводаў. Цяпер важна паглядзець на контр-тэзісах наконт тэзісаў нашага ЦК аб пяцігадовым пляне:

«Ці даюць яны (тэзісы) самастойны плян вырашэньня каренных пытаньняў аб капітальных затратах прамысловасьці? Не. І гэтыя яны дапамагаюць таму, што на практыцы ўсё больш «торжествуют» анты-пралетарскія тэндэнцыі ў асноўным пытаньні аб суадносінах сацыялістычных і капіталістычных элементаў нашай гаспадаркі». Паводле трацкісцкай плятформы выходзіла, што тэзісы партыі аб пяцігодцы вялі да «торжества» анты-пралетарскіх тэндэнцый». Ну, ці ня сьмешна гэта чытаць пасьля чатырох год? Што таварышы аб тэмпах капітальнага будаўніцтва прамысловасьці з другога пляну, з правага пляну?

З правага боку, праўда, у даводзі заблытанай форме, але з ясна выказанай палітычнай тэндэнцыяй, гаварылі, прыкладам, так:

«Нельга разумець справу так, што ўкладаньні ў прамысловасьць увесь час будуць узрастаць у геометрычнай прагрэсіі аж да разгорнутага камуністычнага ладу, мысьліма і паніжэньне крывой укладаньняў».

Адным словам, правыя зварочвалі на «крывой» у бок (сьмех).

Возьмем цяпер тое, што гаварылі контр-тэзісы трацкісцкай апазыцыі аб палітыцы партыі ў вёсцы? А вось што:

«Тэзісы ЦК зусім няправільна бяруць за адну дужку капіталізм у горадзе і капіталізм у вёсцы, сьцьвярджаючы, што і аграрны капіталізм разьвіваецца толькі абсалютна. На самой справе, капіталізм у вёсцы расьце і абсалютна і адносна, расьце: з вялікай хуткасьцю і з кожным днём павялічваецца залежнасьць савецкай дзяржавы і ле прамысляў. Спытаць-бы наша кулацтва зараз, пасьля трох год пяцігодкі, ці вельмі мы ад яго залежным, ці больш яно залежыць ад савецкай улады (сьмех).

З другога, з правага пляну з дня ў дзень пішы, што «асноўнай крыніцай хлеба будуць яшчэ доўгі час індывідуальныя гаспадаркі сялян», а таму ціхай з наступленьнем на кулака. Як вядома, аднаасобнікі не згадзіліся в праваўхілістамі і масамі паваліці ў калгасы ўжо ў 1929 г. Усе мы добра ведаем, як гэта адбылося, і таму я абмяжоўваюся сказаным.

Але галоўнае, урэшце, заключаецца ў тым, што «левыя» і правыя апазыцыянэры гаварылі аб перспектывах пралетарскай рэвалюцыі ў цэлым. Напомнім і аб гэтым. У контр-тэзісах трацкістаў разьвівалася вусьлівая мысьліцка аб узьнікненьні «заройку двухуладьдзя, якое пагражае дыктатуры пралетарыяту» (падкрэслена ў арыгінале). Вядома, што трацкісты абвінавачвалі нашу партыю ў тым, што яна вядзе справу да «тэрмідору», г. зн. да краху рэвалюцыі.

Што выпліва з гэтага працэнта—можна бачыць хаця-б з фактаў, якія адносяцца да выкананьня першай пяцігодкі, і з задач, намечаных імі на другую пяцігодку. У той-жа час дрыгога, з правага пляну, жаласьлівым голасам паўтаралі прыкладна наступнае: «У тым-то і бяда, што ўсё тое, што мы будуем, усе гэтыя фабрыкі і заводы могуць у хуткім часе дастацца белагвардзейцам». Можа быць, сякія-такія дурненькія белагвардзейцы на што-небудзь і разьлічалі ў гэтым выпадку, але тым больш шае расчараваньне павінна было апаткаць іх пасьля. А на сутнасьці гэта было паўтарэньне трацкісцкай-жа мысьлі аб клясах і пралетарскай дзяржаўнасьці.

II. Палітычная ўстаноўка другой пяцігодкі

Палітычная ўстаноўка другой пяцігодкі дана ў тэзісах у наступнай фармулёўцы:

«Вялізарныя прыродныя багацьці краіны, бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, узрастаючая актыўнасьць шырокіх мас рабочых і калгаснікаў і правільная лінія партыі поўнасьцю забясьпечваюць такое разгортваньне продукцыйных сіл сацыялістычнай гаспадаркі ў другім пяцігодзьдзі, на аснове якога будуць канчаткова ліквідаваны капіталістычныя элементы ў СССР. Канферэнцыя лічыць, што асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі зьяўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элементаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын параджаючых клясы, для розьніцы і эксплёатацыі, і фармальнае перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, пераўтварэньня ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, на аснове ліквідацыі парэзытычных клясавых элементаў і агульнага народнага даходу, які цалкам ідзе ў распараджэньне працоўных, павінен быць дасягнут значна больш хуткі ўздым дабрабыту рабочых і сялянскіх мас.

Канферэнцыя лічыць, што забясьпечэньне насельніцтва асноўнымі спажывецкімі таварамі і ў тым ліку прадметамі харчаваньня павінна да канца другой пяцігодкі павялічыцца іменна чым у 2-3 разы супроць канца першай пяцігодкі».

У прыведзеным адрыўку тэзісаў поўнасьцю дана палітычная ўстаноўка другой пяцігодкі. Мне прыдзецца спыніцца толькі на самых асноўных палажэньнях гэтага адрыўку.

Пачну з пытаньня аб клясах і клясавай барацьбе.

У тэзісах гаворыцца, што да асноўнай палітычнай задачы другой пяцігодкі адносіцца «канчатковая ліквідацыя капіталістычных элементаў і клясаў наогул», і «пераўтварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Прыведзеныя словы выказваюць самы галоўны элемент палітычнай устаноўкі другой пяцігодкі. Марксызм-ленінізм вучыць таму, што сацыялізм—гэта зьнішчэньне клясаў, што сацыялізм — гэта стварэньне бясклясавага грамадзтва. Такім чынам, у прыведзеных словах сфармулявана задача пабудовы сацыялізму.

Ці правільна тут пастаўлена задача ў адносінах клясаў? Ці ажыцьцяўляе задача ліквідацыі клясаў так, як яна пастаўлена ў тэзісах ЦК? Мне здаецца, ня толькі правільна і ня толькі ажыцьцяўляе гэта задача, але адзіна такая палітычная пастаноўка задач другой пяцігодкі і выцякае з палітыкі партыі, з марксызму. Галоўнае пытаньне, якое павінна быць пры гэтым разгледжана, заключаецца ў тым, наколькі правільна, што ў другой пяцігодцы мы можам паставіць сабе задачу канчатковай ліквідацыі капіталістычных элементаў. У гэтым соль пытаньня.

Калі з гэтага канца ўзяцца за разгляд пытаньня аб клясах у наступным пяцігодзьдзі, то тады, і толькі тады, можна канкрэтызаваць пастаноўку пытаньня і атрымаць ясны і бассрочны для бальшавіка адказ.

На самой справе, разьбярэмся ў асноўных фактах.

Прыняты партыяй народна-гаспадарчы плян на 1932 г. мяркуе, што ў народным даходзе Савецкага Саюзу ўжо да канца першай пяцігодкі ўвесь прыватны сэктар будзе займаць менш 10 проц. Наступны факт. У нас ужо выш 60 проц. калектывізаваных сялянскіх гаспадарак і ня можа быць ніякага сумненьня ў тым, што пастаўленая партыяй задача ў 1932-33 г. у асноўным скончыць калектывізацыю ў СССР будзе выканана. А гэта-ж значыць, што ўжо на працягу двух бліжэйшых год на аснове суцэльнай калектывізацыі будзе ажыцьцёўлена ліквідацыя асноўнай часткі капіталістычных элементаў вёскі. Нарэшце, дадайце да гэтага, што капіталістычныя элементы ў буйнай прамысловасьці ўжо даўно пайшлі да дна, а ў дробнай прамысловасьці і ў гандлі роля іх хутка скарачаецца. Значыцца, ня можа быць ніякіх сумненьняў, што партыя ў другой пяцігодцы можа і павінна паставіць перад сабой задачу канчатковай ліквідацыі капіталістычных элементаў. Але, гаворыць нам: капіталістычныя элементы, калі ласка, ліквідуйце канчаткова, але як-жа з ліквідацыяй клясаў наогул? Між тым, у такой пастаноўцы пытаньня ёсьць грубая ўнутраная супярэчнасьць, якая вядзе да вялікай блытаніны.

Як вядома, асноўная задача сацыялізму заключаецца ў зьнішчэньні капіталізму, імкнучы ў зьнішчэньні клясаў, г. зн. у зьнішчэньні эксплёатацыі чалавека чалавекам. З гэтага вынікае, што поўная ліквідацыя капіталістычных элементаў азначае ліквідацыю клясы эксплёататараў, а бяз эксплёататараў няма і эксплёатаваных.

У тэзісах гаворыцца аб неабходнасьці «поўнага зьнішчэньня прычын, якія параджаюць клясавыя розьніцы і эксплёатацыю». У чым гэта навіна выцякае? Мы, бальшавікі, добра ведаем у чым гэта выцякае, бо бальшавікі зрабілі сацыялістычную рэвалюцыю, якая пачынаецца з пераходу ў грамадзкія рукі, у рукі дзяржавы сродкаў вытворчасьці, а іменна—зямлі, фабрык, заводаў і інш. Асновай эксплёатацыі чалавека чалавекам зьяўляецца прыналежнасьць асобным людзям гэтых сродкаў вытворчасьці і адсутнасьць іх у іншых людзей. Гэта падзяляе людзей на клясы і параджае эксплёатацыю.

Мы ведаем, што ў адносінах буйнай прамысловасьці і зямлі пранёс пераходу сродкаў вытворчасьці ва ўласнасьць дзяржавы адбыўся даўно. Ён адбываецца цяпер і фазам з канчатковай ліквідацыяй капіталістычных элементаў поўнасьцю скончыцца і ва ўсіх іншых галінах гаспадаркі. Тым самым зьнішчэньне прычын, якія параджаюць клясавыя розьніцы і эксплёатацыю, будзе ажыцьцёўлана.

Пасьля ўсяго сказанага ясна, што поўная ліквідацыя капіталістычных элементаў і поўнае зьнішчэньне прычын, якія параджаюць клясавыя розьніцы і эксплёатацыю, азначае тым самым і ліквідацыю клясаў наогул. Калі няма капіталістычных элементаў, г. зн. няма эксплёататараў і калі поўнасьцю ліквідаваны крыніцы клясавай розьніцы, аб якіх жа клясах можна тады гаварыць? Тады і аб клясах ва ўласным сэнсе слова жо гаварыць нельга. Значыць той, хто стаіць задачай другой пяцігодкі поўную ліквідацыю капіталістычных элементаў, той намінуча разам з тым павінен стаіць і задачу ліквідацыі клясаў наогул.

Зразумела, ліквідацыя капіталістычных элементаў зьвязана з вялізарнымі труднасьцямі, з пер

XVII канфэрэнцыя УсеКП(б)

ВЫНІКІ РАЗЬВІЦЬЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ЗА 1931 ГОД І ЗАДАЧЫ 1932 г.

Даклад тав. АРДЖАНІКІДЗЭ (працяг) *)

2. ПЛЯН 1932 ГОДУ І ЯГО ЗАДАЧЫ

— Таварышы, пляны на 1932 год устаноўлены разьмер прамысловай прадукцыі ў 37,5 млрд., або 36 проц. прыросту ў параўнаньні з 1931 годам. Зьні жоньне сабекошту—на 7 проц.; колькасьць рабочых паляна ўзрасьці на ўсёй прамысловасьці, уключаючы будаўніцтва, на 1.200 тыс. чал.; заработная плата павялічыцца на 11 проц. у прамысловасьці і 5,6 проц. у будаўніцтве; прадукцыйнасьць працы павінна павялічыцца на 22 проц.; аб'ём капітальных работ складае па ўсёй прамысловасьці разам з аплатай дадатковым асигнаваньнем 11.790 млн. руб., у тым ліку па галіне прамысловасьці —9.200 млн. руб.

Вось, таварышы, плян 1932 году. У гэтым плане асабліва высоўваецца і ставіцца, як цэнтральная задача ўсяго народна-гаспадарчага плану, выканаць не вытворчай праграмы і пляну капітальнага будаўніцтва па чорнай мэталюргіі, вугалі і машынабудаўніцтве.

Чорная мэталюргія

Мы з вамі ведаем, што на мэталюргіі мы даволі значна адстаем. Калі па ўсіх нейных галінах прамысловасьці мы моглі значны рост у 1931 годзе, то па мэталі мы засталіся на тым-жа самым узроўні.

У чым тут справа? Якія прычыны не далі нам магчымасьці выканаць плян на чорнай мэталюргіі ў 1931 годзе. Трэба проста сказаць, што плян быў не маленькі, трэба было даць на працягу году прырост на 3 млн. тон чыгуну, але мы не змаглі даць ня толькі 3 млн. тон, але нават непаўнай соцень тысяч тон прыросту. Больш таго, мы недадалі некалькіх дзесяткаў тысяч тон чыгуну да 5 млн.

Я ўжо гаварыў аб тым, што ў першым квартале па прамысловасьці вельмі моцна ўзарвала дрэнная работа транспарту. Калі хочаце, транспарт ні адну галіну прамысловасьці так моцна ня ўдарыў, як мэталюргію, бо весьці домну на палавінным ходзе, ці сёньня кушаць яе з-за недавазу руды або коксу, а на другі дзень не ачуваць без выстарчальных запасаў коксу, руды, флюсаў,—гэта значыць падвяргаць домну значнаму разбурэнню. Калі на машынабудаўнічым заводзе не хапае сёньня металю, завод не працуе, але варштаты застаюцца на сваім месцы бяз усякага разбурэньня. Заўтра мэталь падыйдзе, і работа пойдзе паранейшаму. Ня тое з домнай. Яе трэба весьці на поўным праваільным рэжыме. Мець адпаведнай якасьці кокс, руду, флюсы і ў патрэбнай колькасьці,—толькі ў гэтым выпадку нармальная работа домны з боку матар'яльу забясьпечана. Вы гэтых элементарных умоў няма правільна працуючага мэталюргічнага заводу, без гэтых умоў яго апраты падпадаюць заўчаснаму зношэньню і разбурэньню.

Другая, або вярней самая асноўная прычына—инжынэрны недахват інжынэрна-тэхнічных кадраў. Не аказалася даволі вопытных інжынэраў, якія-б ведалі мэталь, якія-б ведалі жыцьцё домны, якія-б сачылі за домнай і ведалі, калі і што адбываецца ў ёй. Тав. Межлаук В., які доўгія гады стаяў на чале мэталюргіі, летам мінулага году быў на заводзе імя Дзяржынскага і аддаў пісаў мне, што на заводзе самыя адказныя месцы ў цэхах займаюць малодыя інжынэры, якія толькі ўчора пакінулі школьную лаўку, добрыя хлопцы, энтузіясты, праз год—два—пры з іх выйдуць добрыя інжынэры. Гэта безумоўна, але сёньня яны вучацца, і гэта вучоба каштуе домне ня мала.

Урэгулёўка ў зарплаце таксама адыграла свае адмоўную ролю. Я аб ёй гаварыў.

Жыцьцёвыя ўмовы рабочых чорнай мэталюргіі, снабжэньне і харчаваньне рабочых таксама былі пастаўлены ня валяна.

Вытворчая праграма ў мінулым годзе не ўдалася. Вытворчасьць мэталюргічных заводаў толькі зараз пачынае даваць некаторыя результаты. Учора мы мелі 17.000 тон сутачнай выплавы чыгуну, гэтага ніколі пана мэталюргіі не давала. Сёньня мы маем 16.600. Я гаварыў таварышом, якія працуюць у мэталюргіі: гладзеце, вы даеце ня 17.000 тон запраўдашні адпаведна XVII партыйнай канферэнцыі, або ў дзень не аладзіцца—гэта добра, але ня тавацеся лепшы назад, уніз.

Работа нашай паўднёвай мэталюргіі за студзень месяц паказала, што дзейныя домны, пры умелым іх абслугоўваньні, могуць даць значна больш, чым давалі. На праваму 1931 году не маглі вынесьці з такіх каэфіцыентаў скарыстаньня карыснага аб'ёму доменных печаў, як 1,70 — 1,80 — 2, а то і больш. Сталінскі завод дае ў апошнія дні 1,26, завод імя Томскага і завод імя Фрунзе—1,30—гэта на першы час ня дрэнна. Трэба дабіцца, каб студзеньскі посьпех быў разьвіт, і тады праграма будзе выкананая. Больш таго, пры добрай рабоце дзейныя заводы могуць даць значна больш 6.400 тыс. тон, што яны абавязаны даць паводле пляну. Тут уёй залежыць ад таго, як будзем снабжаць іх рудой, коксам, флюсамі, маніцэтам. У мінулым годзе змучыў нас маніцэт. Мы здабываем яго на Урале, але не змаглі здабыць выстарчальнай колькасьці. У мінулым годзе нас чаргоўна змучыў аглюцэр. Мы пачалі яго з-за мяжы. Гэта ў той час, калі ў нас можна дастаць і на Украіне, і пад Ленінградам, і на Урале колькі хочаш добрай аглюцэрнай глины. Нават простага дамаўту, вапняку не маглі падвезьці да домнаў своячасова.

Тут мы проста ставім пытаньне перад таварышамі з НКПС—яны павінны дапамагчы ва што-б там ні стала паставіць на належную вышыню падвоз матар'ялаў металюргічным заводам. У Крывароскім басэйне на працягу году ляжаць вялізарныя запасы руды, а заводы адчуваюць недахват у руде.

На Урале да гэтага часу няма пералому, работа металюргічных заводаў ідзе па-ранейшаму дрэнна.

Па капітальным будаўніцтве чорнай мэталюргіі мы ня выпрыналі пуску ў эксплёатацыю. Прыклады, некаторых тэрмінаў тут адна нешта было выканаць, напрыклад, на электрозным лічбах 1931 году пры домне № 7 на заводзе імя Дзяржынскага быў пачатак у мае месяцы, а ў студзені 1931 году пакат фундаменту, як трэба, ня было закладзена. Але, ня гледзячы на ўсё гэта, і на капітальным будаўніцтве чорнай мэталюргіі мы кроцкуцца наперад. Мы будуем два вялізарнейшыя заводы—Магнітагорскі і Кузнецкі. Аб гэтых заводах ведаюць усе, ведае ўся краіна. Капітуюць яны вялізарным сродкі, сошні мільярд. Але і на Украіне мы будзем рэканструяваць трох вялікіх заводаў—алмазеўскага заводу імя Томскага, заводу імя Дзяржынскага і заводу імя Варашылава. Ці можна ўяўляць сабе, якіх рамонтаў ідзе там работа?

Што значыць, напрыклад, рэканструкцыя макеўскага заводу? У дасягнуты час ён даваў 230 тыс. тон чыгуну. У 1931 годзе гэты завод даў 402 тыс. тон чыгуну, а ў гэтым годзе ён павінен даць 670 тыс. тон чыгуну.

Іосіф Ст. Пасьля скончэньня рэканструкцыі?..

Арджанікідзэ. Пасьля скончэньня рэканструкцыі завод будзе даваць 1,5 бясьпечнае нам у 1933 годзе 13—13,5 млн. тон чыгуну.

Задачай пляну вытворчасьці і капітальнага будаўніцтва па чорнай мэталюргіі зьяўляецца ня толькі ліквідацыя пазьлічэньне магутнасьцей, але і ажыцьцяўленьне рэзкага якаснага зрушэньня ў структуры мэталюргічнай прадукцыі—рэзкае павялічэньне выробу якасных і высокаякасных сталяй і труб.

Асобнае месца займаюць якасныя, высокаякасныя сталі і фэрасплавы, якія ідуць для выплавкі гэтых якасных сталяй.

Поўная магутнасьць усіх заводаў якаснай сталі, якія будуюцца і рэканструюцца,—1.400 тыс. тон, заводаў фэрасплавай—170 тыс. тон.

Пазьлічэньне вытворчасьці да 630 тыс. тон у 1932 годзе супроць 200 тыс. тон у 1931 годзе залежыць ад пасьпяховага ўводу ў вытворчасьць ладу новых і рэканструяваных заводаў першай чэргі.

Будаўніцтва ў 1932 годзе павінна забясьпечыць увядзеньне ў вытворчасьць на працягу 1933 году ўсёй рэшты магутнасьці на гэтых заводах.

ПА ЯКАСНАЙ СТАЛІ

	Поўная магутнасьць
Дніпроўскі	600 тыс. тон
Электрасталь	120 » »
«Серп і молат»	100 » »
Златаўсьцінскі	200 » »
Верх.—Ісецкі	50 тыс. тон
«Красный Октябрь»	300 » »
Чалябінскі завод нержавеючай сталі (пуск і пуск)	25 » »

ПА ФЭРАСПЛАВАХ

Дніпроўскі	80 тыс. тон
Чалябінскі	40 » »
Заставоўскі (Грузія) (фэрамарганец)	50 » »

Трубы—адзін з самых вострадэфіцытных відаў металюргічнай вытворчасьці. Недахват труб тармозіць разьвіцьцё ладу важнейшых галін народнай гаспадаркі, асабліва нафта і каменнавугальнай. У гэтым годзе мы цярпелі вялізарнейшы голад па трубах. У 1932 годзе будуецца рад трубных заводаў. На двайных заводах стаіцца рад трубных агрэгатаў, якія ў значнай ступені павялічаць колькасьць труб.

Труб жалезных выпушчана: у 1930 годзе—263 тыс. тон; у 1931 годзе—292 тыс. тон; плян 1932 году—432 тыс. тон.

Поўная магутнасьць трубных заводаў, якія будуюцца і рэканструюцца, — 1.700 тыс. тон.

Магнітагорскі завод (трубны цэх)—470 тыс. тон; Нікапольскі—410 тыс. тон; Марыупальскі завод—265 тыс. тон (увод у пачатку 1933 году новага пільгернага стану на 100 тыс. тон); Таганрогскі—150 тыс. тон (увод у канцы 1932 году новага пільгернага стану на 100 тыс. тон); імя К. Лібкнэхта—127 тыс. тон (увод у сярэдзіне 1933 г. новага пільгернага стану на 30 тыс. тон); Перша-Уральскі завод — 95 тыс. тон.



ВУЗДА. Калгас «Будаўнік», Вузьдзенскага раёну, па-бальшому рыхтуецца да сустрэчы трэцяй бальшавіцкай вясны. Зроблен пералічэньне усяго с.-г. інвэнтару. Рамонт інвэнтару даручан поўным калгасьнікам (сталяры, цесьляры і кавалі). Для рамонту збруі набыт матэрыял і мабілізаваны на гэту работу рымары калгасу. Насеньфонды осьпаны. Ужо пачата ачыстка насеньня. Брацінаваны фонды складзены і цалкам забясьпечаюць рабочую жывёлу на час пасеўнай кампаніі. Пры калгасе арганізаваны курсы брыгадзіраў на 15 чал. Курсы працуюць ужо 2 месяцы.

Складзен плян веснавой пасеўнай кампаніі і абмяркован на сходзе калгасьнікаў. Вызначаны вучасткі пасеваў асобных культур. Да кожнай брыгады прымацаваны пазасобныя вучасткі і да кожнага калгасьніка да вядзен плян яго работы.

Усяго па веснавую пасеўкампанію калгасу патрэбна 2.157 працадзён і 2.221 конадзень. Працадзоньных калгасьнікаў, якія штодзённа могуць працаваць на полі, ёсьць 131 чал. Такім чынам, на кожнага калгасьніка прыпадае 17 працадзён. Рабочых коньмі ёсьць 48 шт., але для хутчэйшага правядзеньня веснавой сяўбы іх усё-ж ня хопіць. Патрэбна дапамога МТС.

КАЛГАСЬНІК.

28 лютага быць гатовымі да выхаду ў поле

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Калгас «Гігант», Бараскага сельсавету, у мінулым годзе першым у раёне і Беларусі правёў праверку падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы, арганізаўшы пробны выезд у поле. У гэтым годзе памылак летаўшай падрыхтоўкі да сяўбы ён ніякпеца не дапусьціць.

Ужо складзен плян пасеўнай кампаніі і шырока абгавораны на калгасным сходзе. Арганізаваны спэцыяльны курсы па падрыхтоўцы брыгадзіраў і арганізатараў працы, на якіх займаецца 27 чал. Зроблен агляд усяго інвэнтару. Увесь неспраўны інвэнтар рамантуюць спэцыяльныя брыгады калгасьнікаў.

Поўнасьцю закончана вызначэньне гною пад ураны клін. Складзены і ссыпаны насенны, страхавы і кармовы фуражныя фонды. Прыступілі да ачысткі насеньня. Калгасьнікі абавязаліся сабраць ня менш 1.300 кгр. попелу ў сваім калгасе, павысіць ураджайнасьць збожжавых культур ня менш, чым на 10 проц.

Поўную падрыхтоўку да веснавой сяўбы калгасьнікі абавязаліся скончыць да 28 лютага і ў гэты-ж дзень зрабіць праверку гатоўнасьці да сяўбы пробным выездам у поле.

Пачын калгасу «Гігант» павінны падхапіць усе калгасы БССР, правяраючы шляхам пробнага выезду ў поле гатоўнасьць да 3-ай бальшавіцкай весны.

А. Шустры.

Загатаўляць ня менш 10 проц. пляну ў пяціднёўку

толькі такія тэмпы работы гарантуюць завяршэньне ільназагатоўчай кампаніі ў тэрмін

Падцягнуць Ільнаводчыя раёны

Па групе ільнаводных раёнаў за апошнюю пяціднёўку плян ільназагатовак выкананы толькі на 1,1 проц. Асобныя раёны не далі амаль ніякага зрыву. Напрыклад, па Гарадоцкім раёне прырост за пяціднёўку складае 0,2 проц., па Бешанковіцкім і Віцебскім — 0,3 проц., Бельскім — 0,4 проц., Суражскім — 0,7 проц., і г. д. Толькі Расонскі раён дабіўся некаторага пералому — рост за пяціднёўку на 4,3 проц., Полацкі — 2,3 проц. Адзнак, гэты тэмп ні ў якай меры не забясьпечваюць сваячасовага выкананьня пляну. Яны павінны быць рашуча ўзьняты.

Няма абґрунтаных прычын для замаруджэньня загатовак. Аб гэтым выразна сьведчыць вопыт перадавіноў. Сотні калгасаў, дзесяткі сельсаветаў ня толькі выканалі, але і значна перавыканалі планы. У арушскім і іншых раёнах шырока разгарнулася бухгайная дапамога адстаючым калгасам. Калгасьнікі адказваюць сустрэчнымі планамі на заклік ударнікаў «Дзьвіны».

Мэтад бухгайтэрыі і сацыялістычнай дапамогі патрэбна пазбавіць у асноўу барацьбы за поўнае выкананьне і перавыкананьне планаў ільназагатовак. Мы маем усе магчымасьці, каб да 1-га сакавіка з посьпехам закончыць гэту важнейшую кампанію. Трэба дабіцца, каб кожная пяціднёўка лютага давала прырост ня менш 10 проц. гадавога пляну.

Сустрэчнымі плянамі адказваюць на заклік ударнікаў „Дзьвіны"

КРУПКІ. (АД НАШАГА ОПЭЦКОРА).

РАЙКОМ ПАРТЫІ І РАЙВЫКАНКОМ, АБГАВАРЫЎШЫ ЛІСТ ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАД ФАБРЫКІ «ДЗЬВІНА», ВЫЗНАЧЫЛІ РАД МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, КАБ ДАБІЦЦА СТОПРОЦАНТНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ІЛЬНАЗАГАТОВАК ДА 10 ЛЮТАГА.

СЕЛЬСАВЕТАМ ДАНА ДЫРЭКТЫВА—ШЫРОКА НАПУЛЯРЫЗАВАЦЬ ЛІСТ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ. НА ДАПАМОГУ СЕЛЬСАВЕТАМ НАКІРАВАНЫ 35 РАЁННЫХ АДКАЗНЫХ РАБОТНІКАЎ.

ЗА АПОШНІЯ ПЯЦІДНЁЎКУ СТУДЗЕНЯ НАМЕЦІЎСЯ НЕКАТОРЫ ЗРУХ У ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ. КАЛІ ЗА 27 СТУДЗЕНЯ ПА РАЁНЕ БЫЛО ЗАГАТОЎЛЕНА 1.028 КГР. ІЛЬНАВАЛАКНА, ДЫК 28 СТУДЗЕНЯ—1.234 КГР. І 29 СТУДЗЕНЯ—1.716 КГР.

ПРЫКЛАД УДАРНАЙ РАБОТЫ ПАКАЗВАЮЦЬ КАЛГАСЫ ВЫДРЫЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ЯКІЯ ЗАДАЛЬНЕ ПА ІЛЬНАВАЛАКНІ ВЫКАНАЛІ НА 125 ПРОЦ. І ЗЯЛІ НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР АДНААСОБНІКАЎ. КАЛГАС «КАСЯНЧЫ», ЗАБОРСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ПТУРМАВОЙ РАБОТАЙ СВАЯЧАСОВА АПРАЦАВАЎ ЛЁН І ЗДАЎ ЯГО ДЗЯРЖАВЕ ПОЎНАСЬЦЮ. КАЛГАС «АТРАДНАЕ», КРУПСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ЗАДАЛЬНЕ ПА ІЛЬНАВАЛАКНІ ВЫКАНАЎ НА 100 ПРОЦ., ПА ІЛЬНОСЕМІ—НА 180 ПРОЦ. РАД ІНШЫХ КАЛГАСАЎ ТАКСАМА ПЕРАВЫКАНАЛІ ЗАДАЛЬНЕ. КАЛГАСЫ «ГІГАНТ», ІМЯ ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ І ІМЯ ВАРАШЫЛАВА ВЫСУНУЛІ СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ.

ПОВАЧ З ТЫМ У ПААСОБНЫХ СЕЛЬСАВЕТАХ ЗАГАТОЎКІ ІДУЦЬ САМАЦЁКАМ. ТАК, У КАЛГАСЕ «КАМІНТЭРН», БОБРОСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ДАГЭТУЛЬ НЕ ПАЧАТА АПРАЦОЎКА ІЛЬНУ. СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ ГОРЫН ЗРЫВАЕ АПРАЦОЎКУ ІЛЬНУ, ПА ЯГО ВІНЫ ПАЛОВА УСЯЯ ТРАСТЫ ЛЯЖЫЦЬ ПАД СЬНЕГАМ.

СТАРШЫНЯ БОБРОСКАГА МЯСТАЧКОВАГА САВЕТУ ХАІМЧЫК ПРАЯЎЛЯЕ ПОЎНУЮ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ У АДНОСІНАХ ДА ІЛЬНАЗАГАТОВАК. У ВЫНІКУ ЗАДАЛЬНЕ ВЫКАНАНА НА 13 ПРОЦ.

НЕКАТОРЫЯ КАЛГАСЫ, ЯК «ПРОЧ САХА», ШЭЙСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, І ІНШ. РАЗЬМЯРКОЎВАЮЦЬ ЛЁН ПАМІЖ КАЛГАСЬНІКАМІ У ТОЙ ЧАС, ЯК ЗАДАЛЬНЕ НА ЗАГАТОЎКАХ ДАЛЯКА НЕ ВЫКАНАНА. СТАР ШЫНЯ КАЛГАСУ «ПРОЧ САХА» МАРОЗАЎ ЗАЯВІЎ: «ЛЁН ПАТРЭБЕН НАМ САМЫМ, А ДЗЯРЖАВЕ ЎЖО ХОПІЦЬ».

ГЭТЫЯ КУЛАЦКІЯ ПРАЯЎЛЕНЬНІ НЕ АТРЫМЛІВАЮЦЬ НАЛЕЖНАГА АДПОРУ ЯК З БОКУ ПРАЎЛЕНЬНЯЎ КАЛГАСАЎ, ТАК І СЕЛЬСАВЕТАЎ.

РАЙПУЧА ЎДАРЫЎШЫ ПА КУЛАЦКА-РВАЦКІХ НАСТРОЯХ, ЯШЧЭ ШЫРЭЙ РАЗГАРНУЎШЫ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНУЮ РАБОТУ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ ВЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ, КРУПСКІ РАЁН ПАВІНЕН ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ІЛЬНАЗАГАТОВАК У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС.

Я. КОЗІК.

У авангардзе барацьбы за лён

ЛЕПЕЛЬ.

КАЛГАС ІМЯ МОЛАТАВА, ШЫЧАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ЛЕПЕЛЬСКАГА РАЁНУ, СКОНЧЫЎ АПРАЦОЎКУ І ЗДАЧУ ВАЛАКНА ДЗЯРЖАВЕ. МОЛАТАЎЦЫ ЗЯЗЛІ НА БУКСІР СУСЕДНІ КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ», ДЗЕ Ў ПАРАДКУ КАЛГАСНАЙ УЗАЕМАДАПАМОГІ АПРАЦАВАНА АМАЛЬ ТОНА ІЛЬНАВАЛАКНА.

АСАБЛІВА ЎДАРНУЮ РАБОТУ ПАКАЗАЛІ ТРАЦАЛЬШЧЫЦЫ КАЛГАСУ ІМЯ МОЛАТАВА ЮЦІЧ, КРЫВЕЦ І КУЛЯШ.

БУДЗЬКО.

Вытруціць самацёк з практыкі жывёлазагатовак

Змагацца з недаацэнкаю важнейшай кампаніі

ЦК КП(б)Б і СНК, улічваючы недавальняючы ход жывёлазагатовак у чацвертым квартале мінулага году, далі райкомам і райвыканкомам выразную дырэктыву — разгарнуць загатоўкі ў першым квартале бягучага году з тым, каб да 1-га лютага выкаваць ня менш 45 проц. квартальнага заданьня.

Як-жа выканана гэта дырэктыва? На 1-га лютага плян па БССР рэалізаван усяго

ГЕНЭРАЛЬНАЯ АТАКА ШАНХАЮ

Японскія гарматы бесьперапынна грамяць горад,

ЗЬВЕРСТВЫ АКУПАНТАЎ НЕ ПАДДАЮЦЦА АПІСАНЬНЮ; САЛДАТЫ ПАДПАЛЬВАЮЦЬ КІТАЙСКІЯ ДАМЫ, РАСТРЭЛЬВАЮЦЬ ЖЫХАРОЎ, НЕ ШКАДУЮЧЫ ЖАНЧЫН І ДЗЯЦЕЙ

Штурм Чапэю

ШАНХАЙ, 4. Сёньня з раніцы працягвалася моцная бамбардыроўка гораду. Потым японскія часьці пры падтрыманьні бамбавозаў і цяжкай артылерыі атакавалі розныя пункты пазыцыі кітайскіх войск у раёне Чапэю. Сёньня мела месца **найбольш жорстка бойка за ўвесь час ваеньных апэрацый японскіх войск ў Шанхаі.** Бойка пачалася пасьля таго, як 15 японскіх самалётаў зрабілі разьведку ў раёне пазыцый кітайскіх войск і далі сыгналы. Адначасова пачалася атака чыгуначнай станцыі, якая была разбурана японцамі некалькі дзён таму назад.

Трэцім пунктам атакі японскіх войск быў Усуп. У Бамбардыроўцы Усупа з боку японцаў прымалі ўдзел ваенныя суды. Японскае камандаваньне афіцыяльна паведаміла начальніка порту, што японска-морскія сілы маюць намер акупаваць фарты. Бойка ў раёне Усупу была часова перапынена з прычыны прыбыцьця з Манілы амэрыканскага судна, якое павінна было прасьці праз лінію агню. У сучасны момант бай ў раёне Усупу, а таксама і ў Чапэю працягваецца.

Бамбардыроўкай японскіх ваенных суднаў разбураны парты Усупу. Разбуреньне матывуецца неабходнасьцю забесьпечыць стакой міжнародных морскіх ліній. Бамбардыроўка ваенных суднаў і самалётаў нанесла вялізарныя пашкоджаньні кітайскай часьці Шанхаю. Паўночны вакзал і інш. будынкі гараць. Японскія войскі пачалі другое ўсеагульнае наступленьне. (ТАСС).

Французкі пасол у японскага прэм'ера

ТОКІЁ, 3. Французкі пасол у Токіё Мартэль наведаў Юнукая. Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнга, гутарны Мартэля з Інукай надаецца вялікае значэньне.

Зьверствы японскіх войск у Шанхаі

Салдаты расстрэльваюць жанчын і дзяцей

ШАНХАЙ, 3. Радыцкі чужаземных газэт **завалены паведамленьнямі відавочцаў аб зьверствах японскіх войск у Шанхаі.** Паведамленьні гэтыя, аднак, не публікуюцца з нежаданьня, як піша, у прыватнасьці, ангельская «Норд Чайна Дэйлі Нюс», ускладняць і без таго напружанае становішча. Відавочца, замежныя консулы таксама атрымалі рад такіх лістоў. Аб гэтым можна меркаваць па заметцы амэрыканскай газэты «Ўінінг пост», якая піша, што германскі консул прапанаваў некаторым відавочцам не рабіць газэтам заяў. У «Ўінінг пост» уцікаўшыся з Хонку германскія грамадзяне расказваюць, што **на вуліцах валяюцца трупы і чутно вьецьцё галодных сабак, якія паядаюць гэтыя трупы.** Па вуліцах ходзяць падазроныя асобы, якія **падпальваюць кітайскія дамы і, калі адтуль уцякаюць жыхары, яны страляюць па іх. Калі кітайцы прабуюць убраць трупы забітых, японскія салдаты абстрэльваюць іх з кулямётаў і стрэльбаў,** прыгупаючы іх хаваецца. **Японцы, апранутыя ў цывільную вопратку, жорстка зьбіваюць, а потым прыстрэльваюць кітайцаў, у тым ліку жанчын і дзяцей.**

(ТАСС).

Паніка на іокагамскай біржы

ТОКІЁ, 3. Падзеі ў Шанхаі і пасыпаваўшыя потым выступленьні паслоў выклікалі паніку на іокагамскай біржы шоўку-сыраду. Цэны ўпалі на 10 проц. У результаце ўзарпынню з 1922 году біржа закрыта ўчора і сёньня.

Баі на подступах да Харбіну

ТОКІЁ, 3. Агенцтва Сімбун Рэнга паведамляе з Мукдэну, што **ўчора паміж кітайскімі і японскімі войскамі адбылося вялікае сражэньне ля Яомыня (станцыя на паўднёвай лініі КУЧ).**

* * *

ТОКІЁ, 3. Паводле паведамленьня Сімбун Рэнга з Чанчуня, сьледам за лывізіяй генэрала Тамона ў раён Куанчэнцзы накіравана брыгада Амано ў суправаджэньні авіяцыі, артылерыі і інжынэрных войск.

Газэта «Асахі» з Харбіну падае, што ў результаце нарады чужаземных консулаў, амэрыканскі консул у Харбіне Хэнсон прапанаваў Дзін-Чжоу адступіць з раёну Харбіну. Амэрыканскі консул пры гэтым указаў, што заняцьце японскімі войскамі Харбіну німінуча. Дзін-Чжоу ў гутарцы з амэрыканскім консулам заняў цьвёрдую пазыцыю, указаўшы на неабходнасьць самаабароны.

* * *

ТОКІЁ, 3. Паводле паведамленьня «Асахі» з Цыцыкару, брыгада Сузукі, якая знаходзіцца ў раёне Цыцыкару, згодна атрыманага ўчора загаду, пачала выступіць у паўночным кірунку.

Буйныя ваенныя заказы ў Францыі

ПАРЫЖ, 3. «Юманітэ» паведамляе, што французкая прамысловасьць атрымала буйныя заказы на выраб зброі, ваенных матар'ялаў і амуніцыі для Японіі. Гэтыя заказы, паводле заявы газэты, заключаюцца пазыкай у 800 млн. іен, якая заключана са згоды французкага ўраду. «Юманітэ» патрабуе, каб урад даў свае тлумачэньні наконт гэтага.

Заводы, рыхтуйцеся да веснавой пасеўкампаніі!

ЛІКВІДАВАЦЬ ЗАЛЕЖЫ ЗАПАСНЫХ ЧАСТАК НА „ЧЫРВОНЫМ МЭТАЛІСЬЦЕ"!

Мабілізаваць масы рабочых на барацьбу з бракам прадукцыі

ВІЦЕБСК. Ад своечасовага забесьпячэньня саўгасаў і калгасаў запаснымі часткамі для сельска-гаспадарчых машын залежыць правядзеньне пабаявому веснавой пасеўнай кампаніі. У той час, як на радзе сельсаветаў, саўгасаў і калгасаў рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару затрымліваецца з-за адсутнасьці запасных частак, апошнія па 6 і больш месяцаў ляжаць на заводзе «Чырвоны мэталіст» (Віцебск) і аб іх рэалізацыі ніхто ня думае.

Адных паўфабрыкатаў да плуга «ДТЛРМ» налічваецца: лемяхоў — 1.710 шт., адпавалаў — 386, грабенчатых дугаў — 1.395, пярэдніх і задніх палосак — 1.384, ручак — 310, клёпаных рам — 600, восяй пярэдніх — 2.085.

Каля ліцейнага цэху пад адкрытым небам на працягу амаль году іржавеюць 5.000 калёсікаў для плуга «ДТЛРМ», якія зараз непатрэбны заводу. З верасьня мінулага году на тэрыторыі заводу «Камінтэрн» ляжаць бяз руху 3.800 акучнікаў і 25.000 лемяхоў розных марак (СП6, Ю, ОС) — вырабы заводу «Чырвоны мэталіст». Да гэтага часу не рэалізаваны ня менш 18 тон чыгунных частак да пруду Майсфарта.

Каля сталоўкі заводу «Чырвоны мэталіст» ляжыць вялікая груда акучнікаў, сабраных нарэшце плугоў розных марак.

Каля брамы зборачнага цэху пад адкрытым небам стаяць 40 пяскочных бульбакапалак, якія заіржавелі ад дажджу. На заводзкім двары валяецца вялікая колькасьць лабёдак з матарамі без накрышак, бульбакапалак і розных паўфабрыкатаў, якія ўжо сапсаваліся.

На ленін стаіць справа з мабілізацыяй унутраных рэсурсаў. На працягу 7-8 месяцаў, а часам і больш году на заводзкім цэнтральным складзе знаходзіцца 250 штук «ответственных» скрынак «Вэрмана», 150 метраў вярблюжых пасаў, 2.000 штук вугальных пячотак, 35 наждачных каменьняў і г. д. Усе гэтыя матар'яльны зусім непатрэбны заводу. Па складзе таксама валяецца на некалькі тысяч рублёў старой шпэцапраткі, якую мог на адрамантаваць і скарыстаць.

Праграмай 1932 г. выраб трансьпейсійных точак не прадугледжан. Завод павінен толькі скончыць выраб невялікай колькасьці точак прадукцыі мінулага году, для чаго яму патрэбны каля 2.000 штук шарнікавых падшыпнікаў (імкартны тавар), якіх дасланы заводу Дзяржпоймашынай і ляжаць нескарыстаныя.

Заводская шматтыражка і пасобныя рабочыя ня раз сьцьвердзілі адміністрацыі аб усіх гэтых агідных зьявішчах, але на апошняга часу заводзкія арганізацыі, у прыватнасьці заводзкі вытворчасьці тав. Крыгаль і самарцыйны дырэктар тав. Ястрэмскі, на гэта не рэагавалі. Бюрэйшчыкі і заводзкая камісія на мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Аб вялікіх залежах запасных частак і паўфабрыкатаў вінуе і Сельгасгасабанк, і Белмэталаб'яднаньне, але апошнія ніякіх мер ня прымаюць для хуткай рэалізацыі частак, якія вельмі патрэбны саўгасам і калгасам.

Гэтай справай павінны заняцца адпаведныя арганізацыі. Канкретныя віноватыя ў замарожваньні запасных частак, у поўным ігнараваньні ўказаньняў партыі аб мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

* * *

Завод «Чырвоны мэталіст» (Віцебск) сыстэматычна ня выконвае сваёй праграмы па выробе асноўнай прадукцыі — бульбакапалак, бораў «Зіг-Заг» і карнарозак нават у той час, калі ёсьць усе магчымасьці для гэтага.

Адна з асноўных прычын невыкананьня плану крыецца ў адсутнасьці аперацыйнага кіраўніцтва з боку заводзкай і асабліва цэхавай адміністрацыі, якая ня прымае рашучых мер для зьнішчэньня ўнутрацэхавых і міжцэхавых непаладак. Вось некалькі яркіх прыкладаў.

Выпуск бульбакапалак зрываецца, галоўным чынам, з-за недахопу пляцёных скрынак, пры абточцы якіх такарны цэх дае шмат браку. З выпрацаваных за 15 дзён студзеня 125 скрынак, 80 аказаліся зусім непагоднымі. Гэта зьявішча існуе ўжо на працягу 7 месяцаў і адміністрацыя ніяк ня можа дабіцца яго ліквідацыі.



Могілкі калёсікаў на «Чырвоным мэталісьце».

Адміністрацыя загатовачнага цэху не паклапацілася своечасова загатовіць запасны штамп для штамповкі плянак на боран «Зіг-заг» і плянкі ўвесь час раблілася непрарэльна. Нарэшта зуб'яў нядобраякасная.

Самым «вузкім» месцам зараз зьяўляецца ліцейны цэх, які сыстэматычна выпускае браканаваную прадукцыю. Толькі за адзін дзень 16 студзеня фармоўшчык Машчонак з 45 штук кольцавых падшыпнікаў зрабіў 19 браканаваных, Чэпікаў з 22 поршневых калец даў 12 браканаваных, Скарэвіч з 143 штук шарнікавых падшыпнікаў — 46 браканаваных і г. д. Брыгада, якая фармуе дэталі для карнарозак, таксама выробае шмат браку. Так, Кенькеў з 147 ручак пасаваў 34, Кавагчук з 14 верхніх падшыпнікаў пасаваў 7 і г. д. На ленін працуе і брыгада разьлівальшчыкаў. З 147 выпрацаваных ручак, 20 аказаліся непагоднымі. З 10 задніх станін кузава забракавана 7.

Калі сярод фармоўшчыкаў вылучаюцца лідэратыя ў выробе браку, дык сярод разьлівальшчыкаў гэта ня робіцца, бо да гэтага часу разьлівальшчыкі не прымацаваны да пастаянных дэталяй. Брак фактычна абязьлічан. За браканаваную прадукцыю адказваюць агулам усе разьлівальшчыкі, у тым ліку і добрыя ўдарнікі. З прычыны масавага выробу браку ліцейным цэхам, такарным не пасьпявае напавань зборнаму пазчёвым ківсі, што вельмі бе на своечасовым выпуску карнарозак.

З-за неадпуску Ленінградскім заводам сталёвага ліцьця, завод «Чырвоны мэталіст» на паловы ступеня не пры ступіў да выробу плугоў «Эбрагарна». Замарудзкан і выпуск зменгарных плугоў і запасных частак з-за таго, што «Стальзбыт» гаварыла марыцце водпуск нарадаў на патрэбнае жалезо.

Мэталаб'яднаньне і ВСНГ павінны прыняць рашучыя меры да поўнага забесьпячэньня заводу сыроцам.

Неадкладная задача заводакіраўніцтва і ўсіх заводзкіх арганізацый — гэта мабілізацыя рабочых на рашучае змаганьне за выраб даброякаснай прадукцыі. Неабходна зараз-жа валадзець работу ўнутрацэхавых і брыгадных вытворчых нарад, а таксама міжцэхавых абмэнных нарад.

Брыгада «Зьвязды» — Самуцін, Зарубежны, Німштэйн, Артабалеўскі, Шмацэр.

56.000 сьвінаматак і 180.000 таварных сьвіней—

баявая праграма сьвінасаўгасаў у чацьвертым, заключным

(Да зьлёту ўдарнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў БССР і Заходняй вобласьці)

Ідучы па выпрабаваным ужо партыяй шляху выкананьня зборжавай праблемы—пляну арганізацыі спэцыялізаваных саўгасаў і калгасаў, ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у сваёй гістарычнай адозьве работу па стварэньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі паставілі, як цэнтральную задачу сельскай гаспадарцы на бліжэйшы адрэзак часу.

У галіне будаўніцтва жывёлагадоўчых саўгасаў у Савецкім Саюзе ўжо дасягнуты такія посьпехі, якія ня маюць нічога роўнага ў гісторыі сельскай гаспадаркі капіталістычных краін.

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б у БССР створана моцная база для вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі. Апрача шырокай сеткі старых малочных жывёлагадоўчых саўгасаў створаны 83 сьвінагадоўчыя саўгасы з агульным стадам у 68.629 шт., зданы дзяржаве першыя 19 тыс. таварных сьвіней. Сьвінасаўгасы ўжо займаюць плошчу ў 172 тыс. га. Над вырашэньнем праблемы мяса працуе каля 15 тыс. рабочых і 500 спэцыялістаў.

Рад саўгасаў узорна выканалі свае прамфінпляны, паказаўшы бальшавіцкія прыклады барацьбы за фармаваньне стада і здачу таварнай прадукцыі.

Аднак, праверка работы сьвінасаўгасаў, праведзеная брыгадамі ЦКК-РСІ, матар'ялы трэсту Сьвінавод і другу паказваюць, што многія саўгасы і іх кіраўніцтва ня здолелі яшчэ правільна і прадуктыўна скарыстаць наяўныя ў іх сродкі вытворчасьці і дабіцца бальшавіцкіх тэмпаў росту сьвінагадоўлі. Значныя страты на старце (12,9 проц. па дарослых сьвіньнях і 39,6 проц. па парасятах)—простае пацьвярджэньне гэтаму.

Дзе прычыны таго, што ў саўгасах «Беларусь», «XVI партыезьд», «Горкі-Абчак», «Вызваленьне» і інш. за мінулы год мы мелі больш 50 проц. адыходу парасят і што ў 1932 г. саўгасы «Прагрэс», «Мсьціслаўе», «Пачаевічы», «Палешук», «Носавічы», «Бялынічы» і інш. упэўнадзілі адыход больш 20 проц. парасят і пягнуць уніз крывую росту агульна-саўгаснага стада.

Гэта ў той час, калі такія саўгасы, як «Пяперыня», «Крывое», «Лучыцы», імя Сталіна і «Негарэлае» зьнізілі адыход парасят да 8 проц.

Спасыланьнямі на тую і прычынкі тут ніяк не апраўдаецца. Толькі злосная абязьлічка і безгаспадарчасьць, неказаньне вялікага арганізацыйнага кіраўніцтва з боку заводзкіх і асабліва цэхавых адміністрацый, якая ня прымае рашучых мер для зьнішчэньня ўнутрацэхавых і міжцэхавых непаладак. Вось некалькі яркіх прыкладаў.

Выпуск бульбакапалак зрываецца, галоўным чынам, з-за недахопу пляцёных скрынак, пры абточцы якіх такарны цэх дае шмат браку. З выпрацаваных за 15 дзён студзеня 125 скрынак, 80 аказаліся зусім непагоднымі. Гэта зьявішча існуе ўжо на працягу 7 месяцаў і адміністрацыя ніяк ня можа дабіцца яго ліквідацыі.

Мэтанакіраванае і ВСНГ павінны прыняць рашучыя меры да поўнага забесьпячэньня заводу сыроцам.

Неадкладная задача заводакіраўніцтва і ўсіх заводзкіх арганізацый — гэта мабілізацыя рабочых на рашучае змаганьне за выраб даброякаснай прадукцыі. Неабходна зараз-жа валадзець работу ўнутрацэхавых і брыгадных вытворчых нарад, а таксама міжцэхавых абмэнных нарад.

Брыгада «Зьвязды» — Самуцін, Зарубежны, Німштэйн, Артабалеўскі, Шмацэр.

Атрымаць у 1932 годзе на менш 1,75 апарасу ў сярэднім на адну матку і захаваць ад кожнага ветвавога апарасу ня менш 5,8 таварных сьвіней—вось умовы, ад якіх бутэ залежаць выкананьне пляну мясазагатовак і фармаваньне стада ня толькі ў 1932 г., але і ў наступных гадох.

Таму барацьба за захаваньне маладняка, за далейшае пашырэньне стада, выкананьне пляну злучак, укараненьне ў практыку работы саўгасаў высокай агра-і зоатэхнікі павінна стаць справай усёй КП(б)Б, справай, за якую, закасаўшы рукавы, павінны выступіць у бальшавіцкі паход усе рабочыя калектывы саўгасаў, камсамол, ПТР і прафсаюзы.

Правільная арганізацыя сьвінасаўгасаў немагчыма без уласнай устойлівай кармовай базы. Гэта з усёй сілай падкрэслена пастановай СНК СССР аб разьвіцьці сьвінагадоўлі: «паставіць на 1932 год перад сьвінагадоўчымі саўгасамі і калгасамі ў якасьці асноўнай задачы—стварэньне ўстойлівай кармовай базы для сьвінагадоўлі». Таму фарсаваная падрыхтоўка да трэцяй бальшавіцкай сяўбы, барацьба за ўздым урадлівасьці саўгасных палёў зьяўляецца адной з асноўных задач трэсту Сьвінавод і саўгасаў. І на гэтым рашаючым участку трэба пасьпяхова ліквідаваць аблюмойскія тэмпы.

Пупёўка дна. На запытаньне—пе роальны плян—ленін за ўсё адказа словамі тав. Сталіна:

«Рэальнасьць нашага вытворчага пляну—гэта мільёны працоўных, якія творацьць новае жыцьцё, рэальнасьць нашай праграмы—гэта жывыя людзі, гэта мы з вамі, наша воля да працы, наша гатоўнасьць працаваць па-новаму, наша рашучасьць выканаць плян».

Так, і толькі так адказа ад імя ўсіх 15 тыс. рабочых і спэцыялістаў вылёт ударнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў БССР і Заходняй вобласьці, які заўтра пачынае сваю работу ў Менску.

Так, і толькі так забясьпечаць плян непасрэдна на справе, на вытворчасьці выкананьне і перавыкананьне праграмы фінпляну саўгасаў як у колькасных, так і асабліва ў якасных паказьніках.

Вучыцца на прыкладзе ленінскіх саўгасаў, ленінскіх брыгад, ленінскіх ударнікаў, ленінскіх спэцыялістаў, перадаць шырока вопыт ленінскіх усім сьвінасаўгасам і сьвінагадоўчым саўгасным фермам і на ўзроўні гэта ўзьняць усе саўгасы на больш высокую ступень—адна з цэнтральных задач вылёту ўдарнікаў сьвінагадоўлі.

Выконваючы 6 указаў т. Сталіна, перабудаваўшы работу па-новаму, сваю самую дзорткую крытыку і самакрытыку, ударна ўзгадаваючы не радавую зоа-і агратэхніку, высокую прадуктыўнасьць і якасьць працы, пашыраючы сацыялістычнае спаборніцтва і рост ударнічтва,—мы выкажам і перавыкажам плян будаўніцтва сацыялістычных фабрык мяса.

АЎЧЫНЬНІКАЎ.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

КІТАЙСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ ПАДЫМАЕЦЦА НА БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ АКУПАНТАЎ

Салдацкі камітэт у Шанхаі

ШАНХАЙ, 4. У 19 кантонскай арміі, якая знаходзіцца ў Шанхаі, арганізаван салдацкі камітэт, які выпусьціў адозву з заклікам да кітайскага народу змагацца з Японіяй.

Адозва заклікае грамадзянскае насельніцтва выступаць у тыле японцаў, змагацца ўзброеным шляхам з японцамі, узрываць і разбураць пылкі зносін. Адозва запэўнае сялян і рабочых, што армія ня здасьць пазыцый, ліквідуе ўсе правы, якія захапілі ёю ў Кітаі і дапамога японскім рабочым, салдатам і студэнтам у правядзеньні пераможнай рэвалюцыі ў Японіі, у ліквідацыі чыноўнікаў і капіталістаў. Салдацкі камітэт заяўляе, што будзе прымаць у свае рады карэйцаў, індусаў і ўсіх прычэсных для сумеснай барацьбы супроць імпэрыялізму і капіталізму.

АДОЗВА САКРАТАРЫЯТУ КАМПАРТЫІ АНГЛІІ

ЛЮНДАН, 3. Сакратарыят кампартыі выпусьціў адозву аб арганізацыі 6 лютага па ўсёй краіне масавых мітынгаў у знак пратэсту супроць вайны з Кітаем. «У любы момант—гаворыцца ў адозьве—японскія ваенныя дзеяньні могуць пашырыцца на іншыя вобласьці. У любы момант гэта вайна можа ператварыцца ў імпэрыялістычную інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу. У любы момант імпэрыялістычныя дзяржавы могуць кінуцца адна на другую і выклікаць новую сусьветную вайну, але значна больш жудасных разьмераў. Толькі арганізаваная сіла рабочай класы можа нарушыць планы падпальшчыкаў вайны. Проч «нацыянальны» ўрад, які трацінь мільёны на войны і асуджае на голад рабочых працы краіны».

Адозва бастуючых рабочых

ШАНХАЙ, 4. Таварыства бастуючых у Шанхаі выпусьціла адозву, накіраваную супроць амэрыканскіх, французскіх і ангельскіх імпэрыялістаў, якія дапамагаюць японцам захапіць Шанхай.

У адозьве ўказваецца, што мільёны рабочых і сялян знаходзяцца бяз хлеба. Адозва ганьбіць гаміндапаўскі ўрад, які забараніў армії супрацьдзяцца і сам ганебна ўцёк у Лоянь. Аднак, заяўляецца ў адозьве, салдаты 19 арміі самастойна прыступілі да барацьбы, атрымаўшы бляскучую перамогу.

Адозва заклікае рабочых, салдат і сялян да пільнасьці супроць генэралаў, чыноўнікаў, якія прабуюць схіліць салдат і рабочых на бок контрэвалюцыі. Адозва заканчваецца заклікам арганізаваць рабоча-селянскую ўладу.

Масавыя рабочыя мітынгі пратэсту супроць японскай інтэрвэнцыі ў Кітаі

ЛЮНДАН, 3. Орган кампартыі «Дэйлі Уоркер» публікуе прынятыя на масавых рабочых мітынгах у розных раёнах краіны рэзалюцыі наконт падзей на Далёкім Усходзе. Рабочыя заяўляюць, што буйнейшыя імпэрыялістычныя дзяржавы разглядаюць кітайскія падзеі, як пралёг да вайны супроць СССР. Рабочыя бароўць на сябе абавязацельства стаць на абарону кітайскай рэвалюцыі і СССР і выказваюць рашучасьць напружыць усе сілы, каб перашкодзіць закулісьнаўленьню ваенных планаў ангельскага і японскага ўрадаў.

Вялізарная дэманстрацыя ў Атэнах

АТЭНЫ, 4. Учора вечарам перад будынкам японскага пасольства ў Атэнах адбылася вялізарная дэманстрацыя. Працоўныя гораду Атэн пратэставалі супроць урыву японскай арміі ў Кітай.

НА ЖЭНЭЎСКАЙ ГАСАРЫЛЬНІ

Прапановы савецкай дэлегацыі

ЖЭНЭВА. (Спэцкор. ТАСС). Адбылося пасяджэньне камітэту па выпрацоўцы рэгламэнту канфэрэнцыі на разабраньні. Першапачатковая прапанова сакратарыяту Лігі была — неадкладна арганізаваць 5 камісій: **сухапутных войск, марскую, авіяцыйную, бюджэтную і юрыдычную.**

Сакратар савецкай дэлегацыі — Штэйн выказаўся за арганізацыю чатырох камісій і выступіў супроць арганізацыі бюджэтнай, спасылаючыся на тое, што пытаньне аб мэтазе скарачэньня ўзбраеньня шляхам сьпісваньня ваенных бюджэтаў выклікала рад рэгалосьяў яшчэ на пасяджэньнях падрыхтоўчай камісіі. Супроць неадкладнай арганізацыі бюджэтнай камісіі выступіў таксама член германскай дэлегацыі. Прапанову Штэйна падтрымаў і турэцкі дэлегат. Пастаноўлена адкласьці арганізацыю бюджэтнай камісіі і перанесьці гэта пытаньне на разгляд прэзыдыуму канфэрэнцыі.

У далейшай дыскусіі савецкі дэлегат прапанаваў, каб усялякая прапанова, зробленая якой-небудзь дэлегацыяй, была ў выпадку яе патрабаваньня пастаўлена на галасаваньне канфэрэнцыі. Гэта прапанова была прынята.

Трэцяя прапанова савецкага дэлегата заключалася ў тым, каб па патрабаваньні тэй ці іншай дэлегацыі канфэрэнцыя ставіла прапанову, зробленую гэтай дэлегацыяй, на пайменнае галасаваньне. Савецкі дэлегат матываваў сваю прапанову неабходнасьцю даць грамадзкай думцы поўную справаздачу аб пазыцыі кожнай дэлегацыі ў тым ці іншым пытаньні.

Крывавы балянс польскага фашызму

У адказ на ўзрастаючую хвалю забастовак, рэвалюцыйнай барацьбы сялянскіх мас і нацыянальна-вызваленчага руху прыгнечаных народаў супроць акупацыі, фашысцкая дыктатура Пілсудзкага ўвяла ў Польшчы палявыя суды.

Паводле толькі афіцыяльных даных за некалькі месяцаў крывавай дзейнасьці палявых судоў (па 1-га студзеня 1932 г.) прыгаворана іні да кары сьмерцю праз павешаньне 30 чал., на расстрэлу — 4 чал. **Усе гэтыя прыгаворы выкананы.** Апрача гэтага палявыя суды прыгаварылі да сьмерці рад людзей, якіх гэтыя прыгаворы заменены вечнай катаргай.

У готу лічбу прыкавага балянсу «подвигов» польскай буржуазіі не ўваходзяць мноства рабочых і сялянаў, **без усякага суда забітых паліцэйскімі і шпікамі ў розных часьцях Польшчы.**

Працоўныя масы Польшчы, ня гледзячы на завостраны тэрор фашызму, усё больш і больш пашыраюць сваю барацьбу супроць буржуазна-памешчыцкага прыгнёту, супроць фашысцка-паліцэйскага тэрору. За апошнія два месяцы адбылося некалькі дэманстрацый супроць увядзеньня палявых судоў. Ва Львове, у Лодзі, у Варшаве, у Петракове на шматлікіх мітынгах і сходах рабочых прымаюцца рэзалюцыі супроць палявых судоў.

Інфармацыйны бюлетэнь ЦК МОПР'у ў Польшчы аб 5-га студзеня 1932 г. піша аб палявых судох:

«Агідная машына палявых судоў за працай! Ва ўсіх гарадох Польшчы будуюць шыбеніцы. Кат сьцінаць курэрскім цягнікам з аднаго кута Польшчы ў другі. Тэрор пакіраваны ўжо ня супроць ашэйнак, але супроць шырокіх народных мас. Фашызм адкае палявому суду рабочых і сялян за ўдзел у дэманстрацыях, як гэта было ў Таканове, за барацьбу супроць акупацыі (Баранавічы, Стоўпцы, Коламыя). З гэтай мэтай дэфэнзыва і спэцыяльна пастаўленыя прыказатары і шпікі фабрыкуюць абвінавачаньні аб ідэйным шпіянажы і г. д. Пралетарыят Польшчы, працоўныя масы вядуць цяжкую барацьбу супроць разьюшанага фашысцкага тэрору».

«Абавязкам пралетарыяту ўсяго сьвету, — заканчвае артыкул бюлетэнь, — зьяўляецца актыўна падтрымаць масы працоўных, што змагаюцца ў Польшчы».

Пастрыманна ўзрастаючы рэвалюцыйны рух рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Беларусі і Зах. Украіны пры актыўным падтрыманьні працоўных усяго сьвету будзе ламаць усе перашкоды фашысцкага тэрору.

Р.

8-га лютага а 6-й гадз. вечарам у памяшканьні клюбу мэталістаў (Університэцкая вул.) гарпрафсаветам скліканая **ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ЎСІХ СТАРЭЙШЫХ БРЫГАДЗІРАЎ ГАСПАДАРЧА-РАЗЬЛІКОВЫХ БРЫГАД, ПЛЯНАВІКОЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ВУЧОТЧЫКАЎ РАБОТЫ ГАСПАДАРЧА-РАЗЬЛІКОВЫХ БРЫГАД,** сумесна з пам. дырэктарамі на рабочых прыладах і членамі кансультацыйнага савету на гаспадарчым разьліку пры ГОНС.

Яўка выпрабаванёных таварышоў абавязковая.

Запрашаюцца вытворча-плянавыя сэктары цэнтральных шкаўленьняў.

З лютага домна № 1 дала 70 тон чыгуну

Узоры Магнітагорскага чыгуну адпраўлены ў Маскву

МАГНІТАГОРСК, 3. Сёньня былі 3 плаўкі чыгуну агульнай складанасьцю ня 70 тон. Якасьць чыгуну зусім здавальняючая.

Учора экстраным цягнікам адпраўлены першыя плаўкі бярэзьфаў з адбіткам Леніна з чыгуну першай плаўкі ў Маскву на партканфэрэнцыю.

Сёньня на партканфэрэнцыю выехала дэлегацыя рабочых-ударнікаў домнага цэху і Коксахіму, якія везьлі з сабой першую пробу чыгуну.

* * *

МАГНІТАГОРСК, 3. Пяць першых плавак з поўнай ігнаравальнасьцю паказалі, што домны домнага цэху адпавядаюць тэхнікай абыходжаньня з складанымі механізмамі. Задача бліжэйшых дзён — ад прыбных плавак перайсьці да рэгулярнай эксплёатацыі, стварыць неабходныя ўмовы для выкарыстаньня поўнасьцю ўсёй гігантскай магутнасьці домны, якая тэмпрытыча можа быць давядзена да 1.500 тон у суткі.

Каб дабіцца бесьперабойнага паступленьня руды, неабходна фарсаваць будаўніцтва драбільнай фабрыкі. Для другога комплекту драбільных машын ужо 5 месяцаў гатовы фундаменты, аднак, да мантажу яшчэ не прыступілі. Гара Магнітная снабжае рудой на толькі Магнітагорскі завод, але і Кузьнецкі. Грамадзянасьць Магнітабуду павінна мабілізаваць усе сілы, каб буйнейшую ў СССР домну зрабіць узорнай як па якасьці, так і па колькасьці чыгуну.

Паведамленьні

— ЦКК КП(б)Б скліча нараду-курсы вагадчыкаў бюро скаргаў, сакратароў партклетак і ўказных штатных сакратароў гар. і раёнКК-РСІ. Нарада-курсы адбудзецца 19 лютага 1932 г., у г. Менску.

— Партклетка ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 13 лютага 1932 г., у г. Лепелі будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б на разглядзе выступных апэляцыйных спраў: Плаўдзіка Р. З., Сацукевіча С. В., Капонава Г. Т., Кунцевіча Т. А. (Лепельскі р.), Мароцкага С. М., Школьніка О., Шыкуло М. С., Донцовы Т. О. (Чашніцкі р.). Прысутнасьць выпрашчыманёных таварышоў на ПТ ЦКК КП(б)Б абавязкова. Праезд за свой кошт.

— 6 лютага 1932 г., у 6 гадз. веч., у памяшк. НК-РСІ (Савецкая, 55, ніжні паверх) адбудзецца пасяджэньне аб'яднаньня бюро скаргаў НК-РСІ, на якім будуць разглядзены наступныя справы: Справа Булькульштэйна аб зьняцьці з працы, справа Гомельскага Аўтадарожнага тэхнікуму, справы Лейзаровіча, Ясінскага, Розіна, Лясёдзі, Ніялявецкага, Пільшчыка, Сухела, справа касіршы лазьні № 2 гр. Швайдзль. Усе т.т., якія датычаць гэтых справы, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі: Літаўнік, Жывіца, Каждан і Абрамская (Хэмфармзавод), Казалеўскі, Ігнатовіч, Грынчук, Шчасны, Рольбін, Шубін (Зільвод). Запрашаецца актыў і «ЛК».

— 6 лютага 1932 г., у Доме Працаўсьветы, у 8 гадз. веч. адбудзецца нарада партыйнага і камсамольнага, "што працуюць у школьных установах. Яўка абавязкова.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА
нямецкі мастацкі фільм
ДРУГОЕ ЖЫЦЬЦЁ
Рэжысэр Рыхард Аснальд.
У галоўн. ролях: Гаэ Штуке, Агне Петэрсен, Агнэса Эстэргазі.
ПАЧАТАК СЭАНСАЎ у 2 гадз., 3 гадз. 30 м., 5 гадз., 6 гадз. 30 м., 8 гадз., 9 гадз. 30 м. і 11 гадз.

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня. Гукавы сінхронны фільм ПОБАЧ З НАМІ.
„ПРАЛЕТАРЫ" Каса—ад 12 г. дня 3-я МЯШЧАНСКАЯ (Казаньне ў трох) у 7 частках
„СПАРТАК" Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г. і 11 г. Апошняя, 2-я серыя НІБЗЛУЦГІ (Помста Крымгільды) у 10 ч. Каса—з 4 г. дня.

1 сакавіка адкрываецца падрыхтоўчае аддзяленьне ў БЕЛАРУСКІ РЫБАВОДНЫ ТЭХНІКУМ БЕЛРЫБТРЭСТУ.
Прымаюцца рабочыя, рабочыя саўгасаў, калгасаў бядняцка-серадняцкай часткі і іх утрымаўцы, якія маюць адукацыю ў абсёме 4-5-й групп. Заявы прымаюцца да 20 лютага па адрасе: ст. Жыжмаўчы, Беларускі Рыбаводны Тэхнікум. Да заявы павінны быць прыкладзены дакумант аб асьвеце, даведка аб стане здароўя, аб сал. становішчы, узросьце, дзьве фота-партрэты. Вучні, забясьпечваюцца інтэрнатам.
БЕЛРЫБТРЭСТ.

6 лютага, у 6 гадз. веч. у клюбе МОДСАНПРАЦЫ (Рэвалюцыйная, 3) адбудзецца ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ гарадзкога бюро ІТР
сумесна з секцыямі ІТР прадпрыемстваў і ўстаноў і рабочымі г. Менску.
Перадак дня: даклад дырэктара Інстытуту прамысловасьці тав. Слоніма, прысьвечаны гадавіне прамовы т. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай.
Запрашаюцца дырэктары і старшыні ФЗМК.
ГарміІТ.

Чэрвень, друкарня «Зьвязды».